НЯХАЙ ЖЫВЕ КАМУНІСТЫЧНАЯ ПАРТЫЯ САВЕЦКАГА САЮЗА — КІРУЮЧАЯ І НАКІРОЎВАЮЧАЯ СІЛА САВЕЦКАГА ГРАМАДСТВА!

(З Заклікаў ЦК КПСС).

ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 27 (621) | Субота, 19 кастрычніка 1985 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

## НА СПРАВАЗДАЧНА-ВЫБАРНЫМ ПАРТЫЙНЫМ СХОДЗЕ

Пазаўчора ў актавай зале адбыўся агульнауніверсітэцкі справаздачна-выбарны партыйны сход.

З дакладам па справаздачы партыйнага камітэта ГДУ выступіў яго сакратар **М. І. Старавойтаў**.

Са справаздачай камісіі парткома па кантролю за якасцю вучэбна-метадычнай работы выступіў яе член дацэнт кафедры галіновых эканомік **Б. І. Врублеўскі**.

У абмеркаванні заслуханых справаздач прынялі ўдзел: сакратар партбюро біялагічнага факультэта **В. А. Хількевіч**, нам. сакратара парткома па ідэалагічнай рабоце **Г. Д. Ветлугаеў**, прарэктар па АГР **У. А. Шаўчэнка**, загадчык кафедры педагогікі і псіхалогіі, член парткома **І. Ф. Харламаў**, загадчык НДС **М. І. Твардоўскі**, сакратар камітэта ЛКСМБ **В. А. Асіпенка**, дэкан эканамічнага факультэта, старшыня галаўной групы народнага кантролю **У. Д. Арэшчанка**, партгрупорг кафедры рускай літаратуры **В. А. Громава**, загадчык кафедры фізвыхавання, нам. старшыні прафкома **В. А. Каляда**, студэнт 5-га курса матэматычнага факультэта **В. А. Шведаў**, рэктар універсітэта **Б. В. Бокуць**.

З прамовай на партсходзе выступіў першы сакратар Гомельскага абкома КПБ **А. С. Камай**, які даў ацэнку дзейнасці калектыву універсітэта і яго партарганізацыі за справаздачны перыяд, сказаў аб задачах, над вырашэннем якіх патрэбна працаваць у будучым.

Камуністы універсітэта выбралі новыя саставы партыйнага камітэта і камісіі парткома па кантролю за якасцю вучэбна-метадычнай работы, дэлегатаў на XXV партыйную канферэнцыю Цэнтральнага раёна г. Гомеля.

Прынята пастанова, у якой вызначаны напрамкі дзейнасці партарганізацыі універсітэта на новы перыяд.

У рабоце справаздачна-выбарнага партыйнага сходу ГДУ прынялі ўдзел нам. загадчыка аддзела навукі і навучальных устаноў ЦК КПБ **В. П. Кузьмянкоў**, першы сакратар Цэнтральнага РК КПБ **Г. М. Кускова**, начальнік упраўлення навукі Мінвуза БССР **Б. А. Каледзін**.

Справаздача са справаздачна-выбарнага партыйнага сходу будзе змешчана ў наступным нумары нашай газеты.

## САСТАЎ ПАРТЫЙНАГА КАМІТЭТА

**АСІПЕНКА Вячаслаў Аляксандравіч — сакратар камітэта камсамола.**

**БАЛОГА Уладзімір Паўлавіч — рэдактар шматтыражнай газеты «Гомельскі універсітэт».**

**БОКУЦЬ Барыс Васільевіч — рэктар універсітэта.**

**ВЕТЛУГАЕЎ Генадзь Дзмітрыевіч — дацэнт кафедры палітэканоміі.**

**ГАЛЕЕВА Ларыса Мікалаеўна — старшы лабарант кафедры заалогіі і аховы прыроды.**

**ГРЫБАЙЛА Арсеній Пракоф'евіч — дацэнт кафедры фізікі цвёрдага цела.**

**ЛОБАН Любоў Іванаўна — студэнтка 2-га курса гісторыка-філалагічнага факультэта.**

**МІРОНЕНКА Уладзімір Іванавіч — загадчык кафедры дыферэнцыяльных ураўненняў.**

**МУРАШКА Міхаіл Нікадзімавіч — старшыня прафкома.**

**НЯМКЕВІЧ Ігар Віктаравіч — асістэнт кафедры гісторыі КПСС.**

**ПРАЛЯСКОЎСКІ Юліян Антонавіч — загадчык кафедры хіміі.**

**СЕМЯНЧУК Яўген Антонавіч — дацэнт кафедры гісторыі КПСС.**

**СІСЬКОЎ Валянцін Іларыёнавіч — старшыня спартклуба, ст. выкладчык кафедры тэарэтычных асноў фізвыхавання.**

**СТАРАВОЙТАЎ Міхаіл Іванавіч — сакратар парткома.**

**СТАРАКОЖАВА Валянціна Іванаўна — адказны сакратар пярвічнай арганізацыі ГДУ таварыства «Веды».**

**ХАРЛАМАЎ Іван Фёдаравіч — загадчык кафедры педагогікі і псіхалогіі.**

**ШАМЯТКОЎ Леанід Аляксандравіч — прарэктар па вучэбнай рабоце.**

## ДЭЛЕГАТЫ НА XXV РАЁННУЮ ПАРТЫЙНУЮ КАНФЕРЭНЦЫЮ

АСІПЕНКА Вячаслаў Аляксандравіч — сакратар камітэта ЛКСМБ.

БОКУЦЬ Барыс Васільевіч — рэктар універсітэта.

БОНДАРАВА Раіса Аляксееўна — старшыня партгкамісіі Цэнтральнага РК КПБ.

ВАСІЛЬЕЎ Аляксандр Фёдаравіч — асістэнт кафедры алгебры і геаметрыі.

ВЕТЛУГАЕЎ Генадзь Дзмітрыевіч — дацэнт кафедры палітэканоміі.

ГАРАНІНА Тамара Пятроўна — в. а. загадчыка кафедры этыкі, эстэтыкі і навуковага атэізму.

ДРОЗД Аляксандр Пятровіч — студэнт 3-га курса гісторыка-філалагічнага факультэта.

КАРПЕЙ Тамара Васільеўна — дацэнт кафедры галіновых эканомік.

КОЎШ Уладзімір Антонавіч — старшыня камітэта ДТСААФ ГДУ.

КОСЦІКАЎ Аляксандр Аляксеевіч — старшы лабарант кафедры фізічнага выхавання.

МАКСІМЕНКА Мікалай Васільевіч — загадчык кафедры тэарэтычнай фізікі.

МАТУСЕВІЧ Віталь Уладзіміравіч — загадчык кафедры гісторыі КПСС.

САЛЬНІКАЎ Георгій Аляксеевіч — майстар вучэбных майстэрняў.

СЕМЯНЧУК Яўген Антонавіч — дацэнт кафедры гісторыі КПСС.

СМОЛІНА Аляўціна Пятроўна—дацэнт кафедры навуковага камунізму.

СТАРАВОЙТАЎ Міхаіл Іванавіч — сакратар парткома.

ЦЯРНОЎСКІ Уладзімір Аляксеевіч — швейцар вучэбнага корпуса № 4.

ШАМЯТКОЎ Леанід Аляксандравіч — прарэктар па вучэбнай рабоце.

## ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ

# Пленум Цэнтральнага Камітэта КПСС

**15 кастрычніка 1985 года адбыўся чарговы Пленум Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Савецкага Саюза.**

**Пленум абмеркаваў наступныя пытанні:**

**Аб праекце новай рэдакцыі Праграмы Камуністычнай партыі Савецкага Саюза.**

**Аб змяненнях у Статуце КПСС.**

**Аб праекце Асноўных напрамкаў эканамічнага і сацыяльнага развіцця СССР на 1986—1990 гады і на перыяд да 2000 года.**

**З дакладам па гэтых пытаннях на Пленуме выступіў Генеральны сакратар ЦК КПСС М. С. Гарбачоў. Тэкст даклада публікуецца ў друку.**

**У спрэчках па дакладу на Пленуме выступілі: тт. А. А. Цітарэнка — другі сакратар ЦК Кампартыі Украіны, Р. Ф. Дзяменцьева — другі сакратар Маскоўскага гаркома КПСС, Ю. П. Салаўёў — першы сакратар Ленінградскага абкома КПСС, В. Р. Афанасьеў — галоўны рэдактар газеты «Правда», С. І. Манякін — першы сакратар Омскага абкома КПСС, М. С. Шкабардня — міністр прыборабудавання, сродкаў аўтаматызацыі і сістэм кіравання, А. М. Каралёў — токар Уральскага завода цяжкага машынабудавання імя С. Арджанікідзе, В. П. Дземідзенка — першы сакратар Кустанайскага абкома Кампартыі Казахстана, К. С. Дзэмірчан — першы сакратар ЦК Кампартыі Арменіі.**

**Пленум ЦК КПСС адобрыў прадстаўленыя на яго разгляд дакументы і вырашыў апублікаваць іх для абмеркавання на партыйных сходах, канферэнцыях і з'ездах Кампартый саюзных рэспублік, якія папярэднічаюць XXVII з'езду КПСС, а праект Асноўных напрамкаў эканамічнага і сацыяльнага развіцця СССР на 1986—1990 гады і на перыяд да 2000 года — таксама на сходах у працоўных калектывах, навучальных установах, воінскіх часцях і грамадскіх арганізацыях.**

**На Пленуме ЦК КПСС разгледжаны арганізацыйныя пытанні.**

**Пленум выбраў тав. Талызіна М. У. кандыдатам у члены Палітбюро ЦК КПСС.**

**Пленум вызваліў тав. Рыжкова М. І. ад абавязкаў сакратара ЦК КПСС у сувязі з назначэннем яго Старшынёй Савета Міністраў СССР. Прынята рашэнне аб вызваленні тав. Ціханава М. А. ад абавязкаў члена Палітбюро ЦК КПСС у сувязі з яго выхадам на пенсію па стану здароўя.**

**На гэтым Пленум ЦК КПСС закончыў сваю работу.**

# ВЫПУСКНІКАМ — НАКІРАВАННІ НА ПРАЦУ

**У мінулыя аўторак і сераду было мнагалюдна каля прыёмнай рэктарата. Ішло размеркаванне выпускнікоў універсітэта вытворчых спецыяльнасцей.**

**Першымі атрымлівалі пуцёўку ў самастойнае працоўнае жыццё выхаванцы эканамічнага факультэта. У наступным годзе ён выпусціць 95 эканамістаў па працы і 70 — інжынераў-эканамістаў па арганізацыі механізаванай апрацоўкі эканамічнай інфармацыі.**

Размяркоўваюцца эканамісты па працы. Як і належыць, самы шырокі выбар для тых, хто меў лепшыя вынікі ў вучобе.

Адзін за другім заходзяць у кабінет рэктара для гутаркі з размеркавальнай камісіяй пяцікурснікі. Да кожнага з іх — максімум увагі. Галоўнае, каб не ўшчымляліся правы маладых спецыялістаў. Некаторым жа даводзілася напамінаць і аб іх абавязках. У асобных выпадках даваўся дадатковы час падумаць для канчатковага рашэння свайго выбару.

Увогуле ж геаграфія размеркавання — даволі значная. Гэта — Гомель і Мінск, Гродна і Магілёў, Брэст і Бабруйск, Орша і іншыя гарады рэспублікі.

Як і ў папярэднія гады, выпускнікі эканомфака накіроўваюцца і далёка за межы Беларусі. Так, адна з лепшых яго выпускніц Ірына Салавей паедзе працаваць на Сахалін. Адрасамі размеркавання выпускнікоў сталі Уфа, Узбекістан, Прыбалтыка і іншыя гарады і рэспублікі нашай неабсяжнай краіны.

Па розных месцах раз'едуцца будучым летам і выпускнікі аддзялення арганізацыі механізаванай апрацоўкі эканамічнай інфармацыі.

На гэтым тыдні размеркаваны таксама пяцікурснікі вытворчых патокаў фізічнага і матэматычнага факультэтаў. Накіраванні атрымалі ўжо звыш 300 пяцікурснікаў. Пажадаем жа ім паспяховага заканчэння вучобы і будучай плённай працы.

**Б. ВАЛОДЗІН.**



**На здымку: добры настрой у Ірыны Салавей. Яна паедзе працаваць на Сахалін.**

Фота Д. Баярына.

## САСТАЎ КАМІСІІ ПА КАНТРОЛЮ ЗА ЯКАСЦЮ ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЙ РАБОТЫ

АЛЯШКЕВІЧ Мікалай Іванавіч — с. н. с. НДС.

ВРУБЛЕЎСКІ Браніслаў Іванавіч — дацэнт кафедры галіновых эканомік.

КІЕНЯ Аляксандр Іванавіч — загадчык кафедры фізіялогіі чалавека і жывёлін.

ЛАЗЬКО Рыгор Рыгоравіч — загадчык кафедры ўсеагульнай гісторыі.

МАКАРЭВІЧ Уладзімір Уладзіміравіч — ст. выкладчык кафедры тэарэтычных асноў фізічнага выхавання.

МЯШЧЭРСКІ Аляксандр Пятровіч — дацэнт кафедры гісторыі КПСС.

МІРОНЕНКА Уладзімір Іванавіч — загадчык кафедры дыфураўненняў.

## НА АРГАНІЗАЦЫЙНЫМ ПАСЯДЖЭННІ

На арганізацыйным пасяджэнні новага саставу парткома яго сакратаром зноў выбраны **М. І. Старавойтаў**, яго намеснікамі: па ідэалагічнай рабоце — **Г. Д. Ветлугаеў**, па арганізацыйнай — **І. В. Нямкевіч**.

Намеснікам сакратара парткома выбраны таксама **Ю. А. Праляскоўскі**.

# ІМІ ГАНАРЫЦЦА УНІВЕРСІТЭТ



Галоўны абавязак студэнта — добра вучыцца, настойліва авалодваць выбранай прафесіяй, каб потым прыносіць найбольшую карысць для Радзімы. Гэта стала аксіёмай жыцця студэнта фізічнага факультэта Аляксандра Кірэева. З першага курса ён глыбока засвойвае ўсе курсы праграмы, замацоўвае тэарэтычныя веды ў факультэцкіх лабараторыях, на практыцы.

Цяпер Аляксандр — студэнт 5-га курса. Яго добра ведае большасць выхаванцаў факультэта, з павагай да юнака адносяцца выкладчыкі. Прызнанне і аўтарытэт прыйшлі не самі па сабе. Перш за ўсё яны дасягнуты стараннай вучобай. У залікоўцы А. Кірэева толькі выдатныя адзнакі. З першых гадоў вучобы ён захапляецца і навукова-даследчай работай, удзельнічае ў выкананні гаспадарча-дагаворнай тэмы.

Будучы старастам акадэмічнай групы, Аляксандр праявіў сябе і як важак моладзі, уважлівы таварыш і добры дарадчык.

У гэтым навучальным годзе Аляксандру Кірэеву па праву назначана Ленінская стыпендыя—своеасаблівая адзнака студэнцкай доблесці.

**На здымку: А. КІРЭЕЎ.**

Фота У. Чысціка.

*РЭХА ПРАЦОЎНАГА СЕМЕСТРА-85*

# ДАПАМАГЛІ ШКОЛЕ-ІНТЭРНАТУ

Пасля напружанага летняга сезона прайшло ўжо нямала часу. Аднак і цяпер ва універсітэт працягваюць паступаць падзячныя лісты ад прадпрыемстваў і арганізацый, дзе працавалі студэнты нашага універсітэта. Адзін з іх дасланы ў камітэт камсамола ГДУ ад сярэдняй агульнаадукацыйнай школы-інтэрната г. Рэчыцы. Яе дырэктар М. Е. Кобрынскі, сакратар партарганізацыі Э. П. Чарнашэй, старшыня прафкома Э. Т. Лін і сакратар камсамольскай арганізацыі А. Ф. Булачка пішуць: «У трэцім працоўным семестры на тэрыторыі нашага горада працаваў атрад «Рамантыкі». У вольны ад работы час рабяты прыходзілі ў школу-інтэрнат і аказвалі дапамогу калектыву ў падрыхтоўцы школы да новага навучальнага года. Аказвалі дзейсную дапамогу ў абсталяванні спальных пакояў, сустракаліся з нашымі выхаванцамі, праводзілі мерапрыемствы, гутаркі.

Адміністрацыя, партыйная, прафсаюзная і камсамольская арганізацыі Рэчыцкай школы-інтэрната для дзяцей-сірот удзячны студэнтам за аказаную дапамогу і просяць адзначыць іх пры падвядзенні вынікаў работы студэнцкіх будаўнічых атрадаў».

# ДОБРАЯ ПАМЯЦЬ І ШЧЫРАЯ ЎДЗЯЧНАСЦЬ

Заканчваецца першы тыдзень вучэбных заняткаў пасля асенніх сельскагаспадарчых работ. У іх удзельнічала больш 750 студэнтаў нашага універсітэта. Яны працавалі на палетках калгасаў і саўгасаў Жыткавіцкага, Жлобінскага і Петрыкаўскага раёнаў. Усе атрады імкнуліся паказаць узоры стараннасці, заняць высокае месца ў абласным сацыялістычным спаборніцтве.

Асенні перыяд сельгасработ асабліва памятным стане для першакурснікаў. У працоўных выпрабаваннях адбылося іх сапраўднае знаёмства, а ў некаторых рабят завязалася студэнцкае сяброўства. Адначасова прадастаўлялася магчымасць адчуць, хто на што здольны. А гэта вельмі важна пры выбарах важакоў акадэмічных груп.

Як і ў папярэднія гады, студэнцкія сельгасатрады ГДУ заслужылі шчырую ўдзячнасць сельскіх працаўнікоў за аказаную дапамогу на ўборцы ўраджаю, за шэфства над ветэранамі вайны і працы, усе карысныя справы.

Сёння, бадай, у найбольшым хваляванні байцы атрада «Рытм» (камандзір — загадчык кафедры рускай літаратуры дацэнт **У. М. Сабаленка**, камісар — дацэнт кафедры беларускай мовы **А. А. Парукаў**). У яго састаў уваходзілі першакурснікі аддзялення рускай мовы і літаратуры. Яны працавалі ў саўгасе «Людзяневічы» Жыткавіцкага раёна і зарэкамендавалі сябе з найлепшага боку. Па даных абласнога штаба студэнцкіх атрадаў, якія былі апублікаваны ў абласной газеце «Гомельская праўда» за 11 кастрычніка, СА «Рытм» займаў першае месца ў спаборніцтве атрадаў вышэйшых навучальных установ. На яго рахунку значыліся 327 тон накапанай бульбы, убраны ўраджай таматаў і капусты адпаведна з 2 і 1,5 гектара. Рукамі студэнтаў было пагружана на транспарт 64 тоны бульбы, з 38 гектараў яны ўбралі салому. Сярэднедзённая выпрацоўка склала 122 працэнты да плана.

Атрад «Рытм» — адзін з самых рэальных кандыдатаў на агульнае першае месца ў абласным сацыялістычным спаборніцтве, пераможца якога будзе ўзнагароджаны Ганаровай граматай АК ЛКСМБ з выдачай грашовай прэміі ў памеры 1500 руб.

Пра сельскагаспадарчыя атрады нашага універсітэта неадназова паведамлялася і ў раённым друку. Спашлемся на дзве публікацыі ў жыткавіцкай раённай газеце «Новае Палессе». Вось радкі з допіса жыхара в. Відошын Івана Мікалаевіча Макарэвіча: «Шмат клопатаў восенькай парой у жыхароў вёскі. Трэба спаўна ўбраць вырашчаны ўраджай не толькі на грамадскіх палетках, але і на ўласных прысядзібных участках. Найбольш цяжкасцей, вядома, з копкай бульбы. Асабліва для састарэлых, у каго ўжо і спрыт у руках не той, і сіл малавата.

Ды асабіста я магу пахваліцца ўжо, што сёлета клубні на маіх сотках выкапаны як ніколі рана. За гэта я ўдзячны студэнтам першага курса гісторыка-філалагічнага факультэта Гомельскага дзяржаўнага універсітэта, якія прыехалі ў нашу вёску на ўборку бульбы. З чуласцю яны аднесліся да мяне, ветэрана Вялікай Айчыннай вайны, інваліда II групы, і вельмі старанна папрацавалі ў выхадны дзень, 15 верасня, пад кіраўніцтвам выкладчыкаў: камандзіраў 11 і 12 груп **П. В. Разько і А. А. Цітовай**, камісараў **В. Лаўшука і Нісневіча**.

Ад усяго сэрца мне хочацца падзякаваць юнакам і дзяўчатам за спагаду, пажадаць усім ім моцнага здароўя і выдатных поспехаў у вучобе, а таксама стаць добрымі спецыялістамі і дастойна працягваць справы старэйшага пакалення на карысць Радзімы».

Гэтыя кранаючыя словы былі выказаны ў адрас байцоў атрада «Маналіт». І заслужылі яны ўдзячнасць не толькі за старанную працу, уважлівасць да тых, хто не шкадуючы жыцця змагаўся за іх сённяшні шчаслівы дзень. У заметцы «Радуюць і працай, і песняй», апублікаванай у той жа газеце «Новае Палессе» за 7-га кастрычніка, загадчыца клуба в. Сямянча А. Макарэвіч паведамляла:

«Многа добрых спраў на рахунку студэнцкага сельскагаспадарчага атрада Гомельскага дзяржаўнага універсітэта, які працуе ў саўгасе «Чырвоны бор».

...Студэнты радуюць вяскоўцаў не толькі працай, але і песняй. Так, 2 кастрычніка ў Доме культуры саўгаса яны далі канцэрт мастацкай самадзейнасці...

З густам і па-майстэрску выканалі самадзейныя артысты песні савецкіх кампазітараў, якія былі ўспрыняты гледачамі дружнымі апладысментамі.

Самадзейныя артысты універсітэта выступілі са сваёй праграмай таксама перад жыхарамі вёскі Відошын».

**Сёння мы нагадалі пра справы толькі двух сельгасатрадаў. Спадзяемся, што пра некаторыя іншыя з іх яшчэ напішуць нам самі камандзіры, камісары, байцы.**

# НЕБА ПАКЛІКАЛА НАС

Прыемна ўбачыць у горадзе дзяўчыну ці юнака ў форме бортправадніка. Адразу пачынаеш думаць пра нябесныя вышыні, сучасныя авіялайнеры, цікавую, але нялёгкую працу работнікаў авіяліній.

Восем гадоў назад у Гомельскім дзяржаўным універсітэце, у штабе працоўных спраў вырашылі стварыць новы студэнцкі атрад для работы на борце самалёта. Назвалі атрад «Пралескі». Восем гадоў кожнае лета дзяўчат і нават юнакоў ГДУ можна было ўбачыць у салонах самалётаў. Яны аказвалі неацэнную дапамогу Гомельскаму авіяпрадпрыемству.

Так было і летам бягучага года. Атрад з 23 чалавек (22 дзяўчыны і юнак) пачаў працоўны семестр-85 у Гомельскім аэрапорце. Аднак, перш чым апрануць прыгожую блакітную форму бортправадніка, кожнаму байцу неабходна было пераадолець сур'ёзныя цяжкасці, перашкоды. Вельмі ўжо прыдзірліва аднасілася да кожнага жадаючага стаць бортправадніком медыцынская камісія. Пры аглядзе нас урачамі стваралася такое ўражанне, быццам нас рыхтавалі для палёту ў космас. Але хваляванні засталіся ззаду, усіх нас дапусцілі да палётаў, а наперадзе былі тыдні карпатлівай вучобы. Што і казаць, нялёгка было. Чэрвень — месяц залікаў і экзаменаў, аднак кожны знаходзіў час і для падрыхтоўкі да работы бортправадніка.

Сярод нас былі такія дзяўчаты, хто не ўпершыню працаваў у «Пралесках»— Ніна Дабравольская — камандзір атрада, Ірына Самойлава — камісар, байцы Вольга Белавусава і Таццяна Шаўцова. Усе яны дапамагалі нам, навічкам, і словам, і справай.

Папрацаваўшы ў аэрапорце літаральна некалькі дзён, многія з нас, у тым ліку і я, зразумелі, што работа бортправаднікоў не такая ўжо лёгкая, як здавалася нам на першы погляд. Даводзілася і ўставаць вельмі рана, і вяртацца з палёту далёка за поўнач, выконваць начныя палёты. Але мы ўсё ж разумелі, што работа на борце самалёта — гэта работа, перш за ўсё, з людзьмі, і мы павінны рабіць усё так, каб пасажыры не адчувалі ў палёце нязручнасцей, заставаліся задаволенымі.

Водгукі аб рабоце байцоў «Пралесак» былі добрымі. Дзяўчаты ж стараліся! Кожны месяц план па палётах перавыконваўся. Дзякуючы студэнтам, больш 40 працэнтаў штатных бортправаднікоў атрымалі водпуск.

За добрую працу многія студэнты былі ўзнагароджаны падарункамі, ім уручаны значкі гаркома ЛКСМБ. Сярод іх Вольга Белавусава, Ала Дзегцярова, Ірына Самойлава, Ала Пасечнік, Валянціна Царашкова.

Старшы дыспетчар службы бортправаднікоў А. В. Быркова на апошнім камсамольскім сходзе атрада сказала: «У асноўным вы папрацавалі добра. За дапамогу — вялікае дзякуй! Прыходзьце да нас і на наступны год».

**А. БАЛОГА,**
**баец атрада бортправаднікоў «Пралескі», студэнтка 2-га курса эканомфака.**

*Цвярозасць — норма жыцця*

# ЛЕКЦЫІ—ДЛЯ ПРАФІЛАКТЫКІ

У нашым універсітэце распрацаваны комплекс мерапрыемстваў, накіраваных на недапушчэнне п'янства і алкагалізму сярод выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў. Гэтай мэце падпарадкаваны цыкл лекцый «Цвярозасць — норма жыцця». Ён праводзіцца па лініі арганізацыі таварыства «Веды» і навукова-метадычнай секцыі па прапагандзе маральна-прававых ведаў і савецкага ладу жыцця.

Першая лекцыя з гэтага цыклу — **«Пераадоленне п'янства — неабходная ўмова фарміравання ўсебакова развітай гарманічнай асобы»**— была прачытана кандыдатам філасофскіх навук, дацэнтам Д. Г. Процкай у мінулы аўторак на геалагічным факультэце.

12-га лістапада планам прадугледжана лекцыя «Алкаголь — вораг здароўя», 10 снежня — «Алкаголь і сямейна-шлюбныя адносіны». З імі выступяць вучоныя нашага універсітэта кандыдаты медыцынскіх навук адпаведна І. В. Хадалевіч і В. П. Дзядзіхін.

Цыкл лекцый, якія прачытаюць і іншыя вучоныя ГДУ, разлічаны на ўвесь навучальны год.

# НЕСУМЯШЧАЛЬНАСЦЬ

На кафедры оптыкі старшым перакладчыкам працуе В. А. Захараў. Гэта — яшчэ малады чалавек, мае вышэйшую адукацыю. Да нядаўняга часу ён быў камуністам. Аднак высокае званне члена КПСС Валерый Аскольдавіч бяздумна страціў. Усяму прычынай — выпітае віно. У нецвярозым стане В. А. Захараў упраўляў уласнай аўтамашынай. Ён быў затрыманы работнікамі аўтаінспекцыі. Вынік аказаўся вельмі сумным: ДАІ аштрафавала Захарава на 100 рублёў і даслала прадстаўленне аб яго паводзінах у партыйную арганізацыю ГДУ.

За кіраванне машынай у нецвярозым стане, учынак, якім Захараў зганьбіў званне камуніста, ён выключаны з радоў КПСС.

ДА СПРАВАЗДАЧ І ВЫБАРАЎ У КАМСАМОЛЬСКІХ АРГАНІЗАЦЫЯХ

# У ВАЖАКІ — АКТЫЎНЫХ

Справаздачна-выбарны сход — важная падзея ў жыцці кожнай камсамольскай арганізацыі. Ён павінен прайсці пад знакам мабілізацыі камсамольцаў на дастойную сустрэчу XXVII з'езда КПСС.

На сходзе юнакі і дзяўчаты падвядуць вынікі работы камсамольскіх арганізацый за справаздачны перыяд, прааналізуюць яе дзейнасць па выкананню рашэнняў партыі і камсамола, ацэняць, наколькі жывой, цікавай стала жыццё кожнага камсамольца.

Галоўны сход года павінен прайсці як шчырая размова. Трэба смела і самакрытычна ацаніць стан вучэбнай і грамадскай дысцыпліны ў групах, даць прынцыповую ацэнку фактам безадказнасці, расхлябанасці, п'янства. Прымаемыя рашэнні павінны быць яснымі, канкрэтнымі, ставіць новыя задачы далейшай дзейнасці камсамольскай арганізацыі.

Сур'ёзную ўвагу трэба будзе ўдзяліць выбарам камсамольскага актыву і асабліва камсоргаў. Важаком калектыву павінен стаць камсамолец, здольны згуртаваць, захапіць таварышаў, зрабіць іх жыццё з іх жа дапамогай цікавым, насычаным.

Справаздачна-выбарную кампанію ў камсамольскіх арганізацыях універсітэта трэба завяршыць да 1-га лістапада бягучага года, у акадэмічных групах — да 25-га кастрычніка.

**А. ШАЛДУКОВА,**
**нам. сакратара камітэта ЛКСМБ ГДУ па арганізацыйнай рабоце.**

*Педагагічная практыка*

# БЫЦЬ НАСТАЎНІКАМ

У час гутаркі з настаўніцай СШ № 38 г. Гомеля Марыяй Паўлаўнай Камышынец я пачула словы, якія прымушаюць пра многае задумацца як студэнтам-філолагам старэйшых курсаў, так і нам, іх выкладчыкам. Марыя Паўлаўна, якая ўжо шмат гадоў вучыць рабят рускай мове і літаратуры, сказала: «Праз некалькі месяцаў я развітаюся са школай, з якой мяне многае звязвае, якой шмат аддадзена. І ўсё часцей паўстае пытанне: хто прыйдзе замест нас? З чым? Якая яна, наша змена ў класах перад дзесяткамі цікаўных, назіральных, пільных вачэй рабят?»

Зрэшты, любыя размовы з настаўнікамі школ, куды штогод у верасні мы прыходзім на педагагічную практыку са студэнтамі пятага курса, так або інакш датычаць гэтай тэмы — маладыя настаўнікі, педагогі будучыні. Рэформа агульнаадукацыйнай школы павысіла патрабаванні да кожнага настаўніка, патрабаванні кожнага да сябе. Праблемы, звязаныя з гэтым, у некалькі разоў памножаныя, паўстаюць перад студэнтамі-практыкантамі. Ад таго, якімі бываюць іх першыя самастойныя крокі ў школе, часта залежыць станаўленне маладога настаўніка ў якасці Педагога. Атмасфера добразычлівай патрабавальнасці і гатоўнасці прыйсці на дапамогу, прызнанне практыкантаў калегамі ў настаўніцкім калектыве нярэдка не толькі дапамагаюць студэнтам выконваць задачы педпрактыкі, але і ў многім вызначаюць і фарміруюць стыль іх будучай работы.

СШ № 38 сустрэла студэнтаў-філолагаў гасцінна. Іх пазнаёмілі з мінулым і цяперашнім школы, з імі працуюць вопытныя выкладчыкі рускай мовы і літаратуры. Штотыднёвыя семінары па праблемах школьнага выхавання праводзіць завуч Н. С. Купцова. І студэнты становяцца настаўнікамі. У кожнага гэта праходзіць па-рознаму і ў часовых адносінах і па форме праяўлення: то хочацца самому адказаць на ўсе свае ж пытанні, то нечакана не хапае 45 мінут урока, то раптоўнае пытанне вучня разбурае структуру ўрока, якая абдумвалася гадзінамі, часам проста не хапае таго, што прыходзіць з вопытам.

Вельмі радуе імкненне студэнтаў вучыцца, спрабаваць, знаходзіць. Здараецца, што практыка ў школе прымушае па-іншаму ацаніць магчымасці, здольнасці студэнта. Так было ўжо не аднойчы: выдатнік аказваецца выканаўцам, «урокадаўцам», а той, хто лічыўся ў сярэдніх студэнтах, у першы ж тыдзень прызнаны класам, захоплена шукае новыя формы работы — знайшоў сябе. А ўсё астатняе — справа часу.

Здолела ў патрэбны момант замяніць настаўніка ў класах, дзе вопытныя выкладчыкі вядуць урокі «са стрункай на спіне», студэнтка С. Чарняўская, выпрацоўвае сваю спакойную, памяркоўную манеру правядзення ўрокаў Т. Дзмітровіч. Бачна, што багатым багажом ведаў валодае на ўроках Н. Барынава. Актыўна ўключыліся студэнты ў падрыхтоўку Тыдня рускай мовы.

Тым не менш трэба згадзіцца з думкай многіх настаўнікаў, што ад студэнтаў-філолагаў мы чакаем не проста выканання праграмы практыкі, не проста старannасці. Большай ініцыятывы, энтузіязму, новых сучасных форм і прыёмаў у рабоце з дзіцячым калектывам, захапляючых і нават арыгінальных спраў, але не мерапрыемстваў для справаздачы чакаюць у школе ад будучых педагогаў.

Упэўнена, яны будуць добрымі настаўнікамі — сённяшнія студэнты-практыканты. Трэба толькі пажадаць ім, каб ніколі не вычэрпвалася крыніца ведаў, справядлівасці і дабраты, якая жывіць сэрца настаўніка.

**Л. КАХОЎСКАЯ,**
**дацэнт кафедры рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства.**



Урок рускай літаратуры ў 9-б класе СШ № 27 г. Гомеля вядзе пяцікурсніца гістфіла Святлана Яфімава.

Фота У. Чысціка.

*Нашы юбіляры*

# АДУХАТВАРЭННЕ



На наступным тыдні спаўняецца 50 гадоў з дня нараджэння дацэнта кафедры этыкі, эстэтыкі і навуковага атэізму Ларысы Іванаўны Нядзеля. Яна нарадзілася ў сям'і кінамеханіка ў сяле Паўлаўка Любечскага раёна Чарнігаўскай вобласці. Пасля заканчэння сярэдняй школы № 1 імя Горкага г. Чарнігава паступіла ў Кіеўскі дзяржаўны універсітэт імя Т. Р. Шаўчэнкі, які закончыла з адзнакай. Па асабістаму жаданню ў ліку дзесяці выпускнікоў паехала працаваць у рэдакцыю Красногорскай райгазеты «Красное знамя» Алтайскага краю. Загадвала аддзелам пісем. Тут і вызначылася навуковае прызванне Ларысы Іванаўны — маральна-этычная праблематыка. Гэта знайшло адлюстраванне ў яе газетных артыкулах, нарысах, фельетонах.

У 1962 годзе Л. І. Нядзеля паступіла ў аспірантуру Кіеўскага дзяржуніверсітэта па спецыяльнасці «Этыка». Па заканчэнні яе абараніла кандыдацкую дысертацыю «Праблема гуманізму ў марксісцка-ленінскай этыцы». На працягу чатырох гадоў працавала ў Чарнігаўскім педінстытуце.

Сапраўды плённая навукова-даследчая работа Ларысы Іванаўны разгарнулася ў Гомельскім дзяржаўным універсітэце. Працягваючы даследаванне ўзаемасувязі гуманізму і маралі, Л. І. Нядзеля апублікавала чатыры манаграфіі: «Гуманізм камуністычнай маралі» (Мн., 1977), «Гуманізм і сучасная ідэалагічная барацьба ў сферы маралі» (Мн., 1978), «Гуманізм і навуковае кіраванне маральным фарміраваннем асобы» (Мн., 1979), «Маральныя асновы сацыялістычнага ладу жыцця» (Мн., 1983). Акрамя таго Ларысай Іванаўнай апублікавана каля 30 артыкулаў, якія прысвечаны маральна-этычным праблемам. Некаторыя з іх змешчаны ва ўсесаюзным і зарубежным друку.

Друкаваныя работы Л. І. Нядзелі знайшлі прызнанне як у этыкаў СССР, так і ў спецыялістаў шэрагу краін сацыялізму. За актыўную навукова-даследчую работу Ларыса Іванаўна ўзнагароджана граматай Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР, Ганаровай граматай Акадэміі навук БССР і Беларускага аддзялення Філасофскага таварыства СССР. Яна — лаўрэат навуковых Ленінскіх чытанняў Гомельскага дзяржуніверсітэта (1983 г.).

Л. І. Нядзеля завяршыла работу над доктарскай дысертацыяй і рыхтуецца да яе абароны.

Навуковыя інтарэсы Ларысы Іванаўны праявіліся і ў вучэбна-выхаваўчым працэсе. Удумлівы падыход да праблем удасканальвання маральнага выхавання студэнцтва дазволіў ёй падрыхтаваць цікавы і самабытны рукапіс «Этыка студэнта», які рыхтуецца да выдання.

Л. І. Нядзеля праводзіць значную грамадскую работу, у якой імкнецца шчодра дзяліцца з людзьмі сваімі ведамі і вопытам. Яна — пазаштатны лектар гомельскіх абкомаў КПБ і ЛКСМБ, кіраўнік тэарэтычнага семінара па камуністычнай маралі і сацыялістычнаму ладу жыцця ў сістэме партыйнай і камсамольскай палітычнай асветы пры Цэнтральным райкоме КПБ. За вялікую работу па камуністычнаму выхаванню моладзі, актыўны ўдзел у лекцыйнай прапагандзе ў 1981 г. Л. І. Нядзеля была ўзнагароджана Ганаровай граматай ЦК ЛКСМБ, а на наступны год — Ганаровай граматай Гомельскага абкома КП Беларусі і абласнога Савета народных дэпутатаў за поспехі па прапагандзе марксізму-ленінізму і палітыкі КПСС, высокую якасць і рэзультатыўнасць марксісцка-ленінскай вучобы.

У нашым універсітэце Ларыса Іванаўна з захапленнем кіруе секцыяй прапаганды маральна-этычных ведаў у школе маладога лектара, дзе на працягу апошніх гадоў практыкуецца такая форма работы як «Этычныя гутаркі» па гомельскаму абласному радыё. Яны выклікаюць у моладзі вялікую цікавасць.

Для Л. І. Нядзелі характэрна не толькі захопленасць этыкай, але і любоў да мастацтва. Дабрата і прыгажосць — вось тыя ісціны, якія адухатвараюць дзейнасць Ларысы Іванаўны, творча яе насычаюць.

**У. КАЛМЫКОЎ,**
**загадчык кафедры філасофіі, доктар філасофскіх навук, прафесар;**
**Т. ГАРАНІНА,**
**в. а. загадчыка кафедры этыкі, эстэтыкі і навуковага атэізму, кандыдат філасофскіх навук, дацэнт.**

# ЗАПРАШАЕ ФАКУЛЬТЭТ ГРАМАДСКІХ ПРАФЕСІЙ

ФГП праводзіць набор слухачоў на 1985-86 навучальны год на наступныя аддзяленні (секцыі, школы, універсітэты).

**Школа маладога лектара.** Тэрмін навучання — 2 гады. У ёй працуюць секцыі:
— палітінфарматараў;
— міжнародных зносін;
— маральна-эстэтычных ведаў;
— навуковага атэізму;
— эканамічных ведаў;
— прапаганды спецыяльных навуковых ведаў;
— антыалкагольнай прапаганды.

**Школа камсамольскага актыву.** Тэрмін навучання — 1 год.

**Атрадных важатых.** Тэрмін навучання — 1 год.

**Журналістыкі.** Тэрмін навучання — 2 гады.

**Арганізатараў культурна-масавай работы.** Тэрмін навучання — 3 гады. На гэтым аддзяленні працуюць секцыі:
— кіраўнікоў танцавальных калектываў;
— кіраўнікоў тэатральных калектываў;
— кіраўнікоў вакальных калектываў.
— Секцыя кіраўнікоў гурткоў і клубаў юных філатэлістаў.

**Экскурсаводаў.** Тэрмін навучання — 2 гады.

**Сацыёлагаў.** Тэрмін навучання — 2 гады.

**Метадыстаў-арганізатараў па ахове прыроды.** Тэрмін навучання — 2 гады.

**Метадыстаў - арганізатараў па турызму.** Тэрмін навучання — 1 год.

**Метадыстаў-арганізатараў па спартыўна-масавай рабоце.** Тэрмін навучання — 3 гады. На аддзяленні працуюць секцыі:
— падрыхтоўкі грамадскіх інструктараў па відах спорту;
— падрыхтоўкі грамадскіх суддзяў па відах спорту.

**Народны універсітэт па ахове помнікаў гісторыі і культуры.** Тэрмін навучання — 2 гады.

Факультэт грамадскіх прафесій запрашае ўсіх жадаючых на свае аддзяленні. Заявы аб залічэнні на ФГП пішуцца на імя дэкана факультэта грамадскіх прафесій і падаюцца ў камітэт камсамола ГДУ (галоўны корпус, п. 1-15).

Студэнтам, якія паспяхова выконваюць вучэбны план аддзялення ФГП, выдаюцца пасведчанні аб атрыманні імі адпаведнай грамадскай прафесіі.

